# Глава III. МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ

## 3.1. Генерал-губернатары і губернатары

*(А. П. Жытко, А. А. Падарожняя, С. А. Талмачова, І. М. Трасцян)*

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі царскі ўрад пачаў распаўсюджваць на іх сваю сістэму мясцовага дзяржаўнага кіравання. Яна стваралася па аналогіі з расійскімі губернямі.

Галоўнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ў Расійскай імперыі былі губерні, якія з 1778 па 1796 г. называліся намесніцтвамі. Губерні (намесніцтвы) узначальваліся грамадзянскімі губернатарамі (намеснікамі). Некалькі губерняў аб'ядноўваліся ў генерал-губернатарствы.

Паводле ўказа Кацярыны II ад 28 мая 1772 г. кіраванне Пскоўскай і Магілёўскай губернямі ўскладвалася на беларускага генерал-губернатара генерал-аншэфа графа З. Чарнышова[1]. З 1778 г. генерал-губернатарства ўтварылі Полацкая і Магілёўская губерні. З 1772 па 1796 г. цэнтрам Беларускага генерал-губернатарства з'яўляўся г. Магілёў, а з 1796 г. – г. Віцебск. У 1823–1831 гг. у склад губернатарства ўваходзілі таксама Смаленская і Калужская губерні (генерал-губернатар князь М. Хаванскі). У студзені-красавіку 1831 г. яно складалася з Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай і Мінскай губерняў, а ў 1831–1856 гг. – Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай[2]. З 1793 па 1796 г. Мінская губерня ўваходзіла ў склад Мінскага, Ізяслаўскага і Брацлаўскага генерал-губернатарства. З 1796 г. яна ў складзе Каменец-Падольскага ваеннага губернатарства, а з 1801 г. – Кіеўскага. У 1834–1856 гг. і ў 1862–1870 гг. – у складзе Віленскага генерал-губернатарства[3].

Слонімская і Віленская губерні ўтварылі Літоўскае генерал-губернатарства (1794–1796 гг.), а з 1796 па 1830 г. – Літоўскае ваеннае губернатарства (з 1801 г. Слонімская губерня пераіменавана ў Гро-

[1] ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 19 (1770–1774). – № 13807. – С. 507.

[2] Шаўкапляс, В. А. Беларускае генерал-губернатарства / В. А. Шаўкапляс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 1. – С. 352.

[3] Філатава, А. М. Мінская губерня / А. М. Філатава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 5. – С. 175.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ